ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 135

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» для IX–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

(базавы ўзровень)

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння зместу гэтага вучэбнага прадмета на базавым узроўні ў IX–XI класах установ адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. У дадзенай вучэбнай праграме на вывучэнне зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» у IX–XI класах вызначана 102 гадзіны, у тым ліку 34 гадзіны ў IX класе (1 гадзіна ў тыдзень), 34 гадзіны ў X класе (1 гадзіна ў тыдзень), 34 гадзіны ў XI класе (1 гадзіна ў тыдзень). Пры гэтым для IX класа прадугледжваецца 5 рэзервовых гадзін, для X–XI класаў – па 4 рэзервовыя гадзіны.

Колькасць вучэбных гадзін, адведзеных у главах 2–4 дадзенай вучэбнай праграмы на вывучэнне зместу тэм у IX–XI класах, з'яўляецца прыкладнай. Яна залежыць ад пераваг выбару педагагічным работнікам мэтазгодных метадаў навучання і выхавання, форм правядзення вучэбных заняткаў, відаў дзейнасці і пазнавальных магчымасцей вучняў. Педагагічны работнік мае права пераразмеркаваць колькасць гадзін на вывучэнне тэм у межах агульнай колькасці гадзін, устаноўленай на вывучэнне зместу вучэбнага прадмета ў адпаведным класе, а таксама паслядоўнасць вывучэння тэм.

Рэзервовы час на вывучэнне вучэбнага прадмета, які прадугледжаны дадзенай вучэбнай праграмай, рэкамендуецца выкарыстоўваць для адпрацоўкі ведаў і ўменняў вучняў па найбольш складаных пытаннях, абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў па вывучаным матэрыяле, абароны праектаў, правядзення тэматычнага і падагульняючага кантролю вынікаў засваення зместу вучэбнага прадмета.

3. Мэты вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства»:

станаўленне адказнай, творчай, маральна-цэласнай асобы, якая валодае развітой свядомасцю, крытычным мысленнем і ўстойлівай маральнай пазіцыяй, здольнай на аснове асэнсавання культурна-гістарычнага вопыту, базавых каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, праблем развіцця сучаснай цывілізацыі і асноўных тэндэнцый развіцця грамадства вызначыць шляхі канструктыўнай самарэалізацыі з улікам маральна-стваральнага выбару, актыўна ўключыцца ў прадукцыйную стваральную дзейнасць.

4. Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства»:

авалоданне вучнямі асновамі навуковых ведаў пра грамадства як цэласную сістэму, што развіваецца ў адзінстве і ўзаемадзеянні яго

асноўных сфер і інстытутаў, сацыяльных працэсах і тэндэнцыях развіцця сучаснага беларускага грамадства і дзяржавы;

фарміраванне грамадзянскай самасвядомасці, патрыятызму і адказнай сацыяльнай пазіцыі, вопыту канструктыўных зносін, узаемаразумення і супрацоўніцтва;

фарміраванне ўстойлівай маральнай пазіцыі на аснове сацыякультурных каштоўнасцей беларускага грамадства, умення адстойваць уласную сістэму каштоўнасцей на аснове павагі да законаў, гістарычных і нацыянальных традыцый Беларусі;

задавальненне адукацыйных запытаў асобы з улікам індывідуальна-ўзроставых асаблівасцей і магчымасцей праз максімальнае набліжэнне зместу вучэбнага прадмета да патрэб і інтарэсаў вучняў;

развіццё ўменняў самааналізу, самаацэнкі; стымуляванне да самаўдасканалення, павышэння агульнакультурнага ўзроўню.

5. Формы і метады навучання і выхавання, якія рэкамендуюцца:

разнастайныя віды вучэбных заняткаў: урок (урок-лекцыя, урок-семінар, урок-канферэнцыя, урок-дыспут, урок-даследаванне, урок-практыкум, інтэграваны ўрок, іншыя віды ўрокаў), вучэбнае праектаванне, экскурсія, іншыя віды вучэбных заняткаў;

разнастайныя метады навучання і выхавання, накіраваныя на актывізацыю самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучняў (метад эўрыстычнай гутаркі, гульнявыя метады, метад праблемнага навучання, метад праектаў, іншыя метады навучання і выхавання).

Мэтазгодна выкарыстоўваць калектыўныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы арганізацыі навучання вучняў на вучэбных занятках у мэтах стымулявання вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па авалоданні імі ведамі, уменнямі, навыкамі, па фарміраванні ў іх кампетэнцый, развіцці іх творчых здольнасцей.

Формы, метады і сродкі навучання і выхавання вызначаюцца педагагічным работнікам. Асаблівую ўвагу варта ўдзяляць удасканаленню спосабаў вучэбнай дзейнасці, неабходных для далейшага самастойнага выкарыстання грамадазнаўчых ведаў пры аналізе сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці. Рэкамендуецца арганізоўваць рашэнне вучэбна-пазнавальных і практычных задач з выкарыстаннем розных крыніц сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, прымяняць метады, якія дазваляюць звязаць навучальны матэрыял, што вывучаецца, з асабістым сацыяльным вопытам і існуючымі ўяўленнямі вучняў пра сацыяльнае жыццё.

Акрамя вучэбнага дапаможніка па вучэбнаму прадмету «Грамадазнаўства», рэкамендуецца выкарыстоўваць нарматыўныя прававыя акты, міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь і іншыя міжнародна-прававыя акты, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі

Беларусь (далей – міжнародна-прававыя акты), навукова-папулярную і публіцыстычную літаратуру, матэрыялы электронных і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі (далей – СМІ). Асаблівай увагі патрабуе выкарыстанне ў адукацыйным працэсе інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, пры гэтым важна разумець іх адукацыйныя магчымасці і выразна ўсведамляць межы іх ужывання, умець арганічна спалучаць гэтыя тэхналогіі з традыцыйнымі методыкамі.

Пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» неабходна абапірацца на веды вучняў па вучэбных прадметах: «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі», «Геаграфія», «Беларуская літаратура», «Руская літаратура» і іншых вучэбных прадметах. З гэтай мэтай рэкамендуецца прапаноўваць вучням канкрэтызаваць тэарэтычныя палажэнні, якія вывучаюцца, гістарычнымі фактамі, літаратурнымі вобразамі, статыстычнымі дадзенымі і іншымі аб’ектамі вывучэння. Рэалізацыі міжпрадметных сувязей будзе садзейнічаць арганізацыя праектнай дзейнасці вучняў, якая патрабуе прымянення ведаў па розных вучэбных прадметах.

Формы, метады і сродкі навучання і выхавання, віды дзейнасці вучняў рэкамендуецца таксама вызначаць з улікам інтарэсаў і пазнавальных магчымасцей вучняў.

6. Змест вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства», вучэбная дзейнасць вучняў, асноўныя патрабаванні да яе вынікаў канцэнтруюцца па наступных змястоўных лініях:

чалавек у грамадстве (IX класс);

асноўныя сферы грамадства (X клас);

сучасная цывілізацыя, асновы права, знешняя і ўнутраная палітыка Рэспублікі Беларусь (XI клас).

Паказаныя ў дадзенай вучэбнай праграме вучэбны матэрыял змястоўнага кампаненту, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў структуруюцца па тэмах асобна для кожнага класа і з улікам паслядоўнасці вывучэння вучэбнага матэрыялу.

7. Чаканыя вынікі вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў IX–XI класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на базавым узроўні:

7.1. асобасныя:

зацікаўленасць у навуковых ведах пра ўладкаванне грамадства; гатоўнасць і здольнасць да самаразвіцця і самаадукацыі, усведамленне значнасці адукацыі для асобаснага развіцця; уменне рацыянальна арганізоўваць свой сацыякультурны вольны час у мэтах асобаснага самаразвіцця;

усведамленне значнасці сацыяльна актыўных і адказных паводзін,

свядомае стаўленне да будучай прафесійнай дзейнасці як да магчымасці асабістага ўдзелу ў вырашэнні грамадскіх, дзяржаўных, агульнанацыянальных праблем;

усведамленне сябе грамадзянінам беларускай дзяржавы і грамадства, сваёй нацыянальнай прыналежнасці; валоданне нацыянальнай самасвядомасцю, пачуццём патрыятызму, інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культурай;

усведамленне неабходнасці кіравацца ў паводзінах каштоўнасцямі і нормамі, замацаванымі ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, а таксама духоўна-маральнымі і сацыякультурнымі каштоўнасцямі беларускага грамадства;

гатоўнасць і здольнасць вучняў да ўсвядомленага выбару далейшай адукацыйнай траекторыі і прафесійнага працоўнага самавызначэння ў адпаведнасці са сваімі магчымасцямі, здольнасцямі і інтарэсамі;

сфарміраванасць маральнай свядомасці, пачуццяў і паводзін на аснове свядомага засваення агульначалавечых маральных каштоўнасцей і традыцыйных духоўных і маральных каштоўнасцей беларускага народа; выкананне прынятых у грамадстве прававых і маральна-этычных норм;

развіццё здольнасці ацэньваць сітуацыю і прымаць усвядомленыя рашэнні, арыентуючыся на маральныя нормы і каштоўнасці;

сфарміраванасць эстэтычных адносін да свету;

усведамленне сям’і як асабістай каштоўнасці, адказныя адносіны да стварэння сям’і на аснове ўсвядомленага прыняцця каштоўнасцей сямейнага жыцця;

свядомае, паважлівае і добразычлівае стаўленне да іншага чалавека, прадстаўнікоў розных культур, іншай думкі; гатоўнасць і здольнасць да ўзаемаразумення, дыялогу і супрацоўніцтва;

паважлівыя адносіны да нацыянальнай культурнай спадчыны Беларусі;

7.2. метапрадметныя:

валоданне лагічнымі аперацыямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі, устанаўлення аналогій і прычынна-выніковых сувязей паміж фактамі і з’явамі, вызначэнне паняццяў, аперыравання паняццямі, мадэлявання, доказу і абвяржэння; уменні рабіць абагульненні і вывады; строіць лагічныя высновы (прыёмы разумовай дзейнасці);

агульнавучэбныя ўменні і навыкі, якія забяспечваюць здольнасць да самастойнага засваення новых ведаў і ўменняў;

уменні выкарыстоўваць засвоеныя веды для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач;

уменні наладжваць супрацоўніцтва і прымаць удзел у розных відах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

уменні прымаць удзел і прыходзіць да агульнага рашэння ў калектыўнай дзейнасці;

здольнасць лагічна і аргументавана выкладаць свае думкі пісьмова і вусна; навыкі ўсвядомленага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў;

уменні адстойваць і абгрунтоўваць уласны пункт гледжання; крытычна ставіцца да свайго і чужога меркаванняў;

валоданне ўменнямі пошуку, адбору, апрацоўкі, захоўвання, перадачы інфармацыі, у тым ліку рацыянальна і бяспечна выкарыстоўваючы інфармацыйныя камунікацыйныя тэхналогіі ў адпаведнасці з вучэбнымі і камунікацыйнымі задачамі;

уменні выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі ў вучэбна-пазнавальных мэтах, выдзяляць галоўнае, істотныя прыметы паняццяў, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй; крытычна ацэньваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, якая змяшчаецца ў розных крыніцах;

уменні самастойна вызначаць мэты і задачы сваёй вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; планаваць эфектыўныя спосабы рашэння задач; прагназаваць вынікі; кантраляваць, ацэньваць вынікі і ў выпадку няпоспеху карэкціраваць вучэбныя мэты і спосабы іх дасягнення;

сфарміраванасць здольнасці да рэфлексіі, самарэгуляцыі, самастойнага вызначэння прыярытэтных задач;

здольнасць і гатоўнасць да вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці;

уменне ўстанаўліваць міжпрадметныя сувязі, інтэграваць веды з розных прадметных галін для рашэння практычных задач;

уменне ўзаемадзейнічаць у розных відах сумеснай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (весці дыялог, вырашаць праблемныя сітуацыі);

7.3. прадметныя:

уменне рашаць тыповыя задачы ў галіне сацыяльных адносін, адэкватных узросту вучняў;

авалоданне асобай шэрагам сацыяльна-псіхалагічных ведаў, маральна-прававых ацэначных меркаванняў, асновамі сучасных тэорый грамадскага развіцця, якія дазваляюць паспяхова адаптавацца і актыўна дзейнічаць у тым ці іншым сацыяльным асяроддзі;

сфарміраванасць асноў правасвядомасці для суаднясення ўласных паводзін і ўчынкаў іншых людзей з маральнымі каштоўнасцямі і нормамі паводзін;

гатоўнасць і здольнасць актыўна, адказна і эфектыўна рэалізоўваць увесь комплекс грамадзянскіх правоў і абавязкаў у грамадстве;

здольнасць аперыраваць сістэмай сацыякультурных ведаў і ўменняў пры ажыццяўленні зносін ва ўмовах дыялогу;

сфарміраванасць здольнасці да рэфлексіі, ацэнкі ўласных магчымасцей і ўсведамлення свайго месца ў грамадстве;

сфарміраванасць уменняў працы з сацыяльна значнай інфармацыяй, яе асэнсаванне; развіццё здольнасцей рабіць неабходныя вывады і даваць абгрунтаваныя ацэнкі сацыяльным падзеям і працэсам;

развіццё сацыяльнага кругагляду і фарміраванне пазнавальнай цікавасці да вывучэння грамадскіх дысцыплін.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IX КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 34 гадзіны, у тым ліку 5 рэзервовых гадзін)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Асаблівасці вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства». Праблема чалавека – ключавая праблема сучаснасці. Навукі аб чалавеку.

### Тэма 1. Чалавек (6 гадзін)

Унікальнасць чалавека. Біялагічнае і сацыяльнае ў чалавеку. Індывід, індывідуальнасць, асоба. Свядомасць і самасвядомасць.

Тэмперамент, характар, здольнасці. Тыпы тэмпераменту і іх характарыстыка. Рысы характару. Віды здольнасцей, узроўні і спосабы іх развіцця.

Эмоцыі, пачуцці, воля. Эмоцыі і эмацыйныя станы. Віды пачуццяў. Развіццё валявых якасцей асобы.

Накіраванасць асобы. Светапогляд і яго роля ў жыцці чалавека. Духоўны свет асобы. Бездухоўнасць і яе прычыны.

Пазнанне чалавекам самога сябе. Спосабы самапазнання. Падлеткавы ўзрост і яго асаблівасці. Я-канцэпцыя і самаацэнка асобы. Шляхі самаразвіцця асобы.

Урок абагульнення.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: воля, індывід, індывідуальнасць, асоба, светапогляд, самаацэнка, самасвядомасць, свядомасць, здольнасці, тэмперамент, характар, эмоцыі;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык праяўленні біялагічнага, псіхалагічнага і сацыяльнага ў чалавеку; тыпы тэмпераменту;

рысы характару; віды і ўзроўні развіцця здольнасцей; эмоцыі і эмацыйныя станы;

характарызаваць тэмперамент і характар чалавека; я-вобразы; светапогляд асобы; спосабы самапазнання; спосабы кіравання эмоцыямі і пачуццямі; прыёмы развіцця валявых якасцей асобы; шляхі самаразвіцця асобы;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі віды эмоцый і пачуццяў; значнасць валявых якасцей у жыцці чалавека; роль светапогляду ў жыцці чалавека; праяўленні духоўнасці і бездухоўнасці ў чалавеку; віды здольнасцей і спосабы іх развіцця; узровень самаацэнкі (адэкватная, заніжаная, завышаная);

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

### Тэма 2. Дзейнасць, зносіны, узаемадзеянне (7 гадзін)

Дзейнасная сутнасць чалавека. Структура дзейнасці. Матывы дзейнасці. Патрэбнасці чалавека і іх віды. Віды дзейнасці. Праца і яе значэнне ў жыцці чалавека. Запатрабаваныя прафесіі на рынку працы.

Зносіны і іх роля ў жыцці чалавека. Зносіны, іх формы. Сродкі зносін. Прынцыпы зносін і этыкет. Віды этыкету. Асаблівасці віртуальных зносін.

Міжасобасныя адносіны. Віды міжасобасных адносін. Узаемадзеянне людзей у малых групах. Лідарства.

Сямейныя адносіны. Шлюб і сям’я. Віды і функцыі сям’і. Узроставыя перыяды жыцця чалавека. Адносіны паміж пакаленнямі. Сям’я як каштоўнасць. Захаванне і ўмацаванне традыцыйных беларускіх сямейных каштоўнасцей.

Супярэчнасці міжасобасных адносін. Паняцце «канфлікт», яго структура і дынаміка. Дзелавыя і асобасныя канфлікты. Спосабы вырашэння канфліктаў (кампрамісныя, антаганістычныя). Унутрыасобасныя канфлікты і іх пераадоленне.

Вырашэнне міжасобасных супярэчнасцей. Правілы канструктыўных зносін і паводзін. Стратэгіі паводзін у канфліктнай сітуацыі. Урэгуляванне канфлікту.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: шлюб, дзейнасць, індывідуалізм, матыў, калектывізм, канфлікт, канфармізм, лідарства, нонканфармізм, зносіны, патрэбнасць, сям’я, стэрэатып;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык ганенне і агрэсіўныя паводзіны ў групе; дзелавыя і асобасныя канфлікты;

характарызаваць структуру дзейнасці; асноўныя віды дзейнасці (гульня, вучоба, праца) і іх роля ў жыцці чалавека; прынцыпы зносін; структуру і дынаміку канфлікту; прыметы ўнутрыасобаснага канфлікту і спосабы яго вырашэння; адрозненні этыкету дзелавых і недзелавых зносін; правілы і асаблівасці бяспечных і канструктыўных інтэрнэт-зносін; правілы канструктыўнага вырашэння канфліктных сітуацый;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі асноўныя віды патрэбнасцей чалавека: біялагічныя, сацыяльныя, духоўныя; узаемасувязь патрэбнасцей і матываў у дзейнасці чалавека; значэнне розных сродкаў зносін; спосабы ўздзеяння людзей адзін на аднаго: заражэнне, унушэнне, перакананне, перайманне; тыпы ўзаемадзеяння: кааперацыя і канкурэнцыя; формы зносін: імператыўнае, маніпуляцыйнае, дыялагічнае; стылі лідарства; узаемадзеянне людзей у малых групах; віды сям’і; функцыі сям’і; значнасць сям’і ў жыцці чалавека; стэрэатыпы і спосабы пераадолення забабонаў ва ўспрыманні іншых людзей; значэнне вырашэння канфліктаў негвалтоўным спосабам; стратэгіі паводзін у канфліктнай сітуацыі (супрацоўніцтва, саперніцтва, кампраміс, пазбяганне, прыстасаванне);

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Тэма 3. Асоба, грамадства, дзяржава (7 гадзін)

Сацыяльныя нормы і паводзіны асобы. Паняцце і прыметы сацыяльных норм. Нормы маралі. «Залатое правіла» маральнасці. Традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці і сацыякультурныя каштоўнасці беларускага грамадства.

Узаемадзеянне асобы і дзяржавы. Дзяржава і яе прыметы. Паняцце права. Права ў сістэме сацыяльных норм. Грамадзянства як прававая сувязь чалавека з дзяржавай.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь. Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь. Структура Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю

Рэспублікі Беларусь, прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 г., і напрамкі ўдасканальвання грамадскіх адносін.

Правы чалавека і грамадзяніна ў Рэспубліцы Беларусь. Паняцце, прынцыпы і пакаленні правоў чалавека. Міжнародныя стандарты па абароне праў чалавека. Правы і абавязкі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь. Прынцып падзелу ўлад. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь – Кіраўнік дзяржавы, гарант Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Усебеларускі народны сход – найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. Органы дзяржаўнай улады і іх паўнамоцтвы.

Правы і адказнасць непаўналетніх. Паняцце правоў дзіцяці і іх абарона. Дзеяздольнасць і адказнасць непаўналетніх у Рэспубліцы Беларусь. Адказнасць, прадугледжаная ў Рэспубліцы Беларусь за ўжыванне і незаконны абарот наркатычных сродкаў.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: Усебеларускі народны сход, дзяржава, грамадзянства, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, мясцовае самакіраванне, мясцовае кіраванне, мараль, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, правы чалавека, права, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, сацыяльныя нормы, суд;

асноўныя міжнародна-прававыя акты ў галіне правоў чалавека;

нарматыўныя прававыя акты ў галіне абароны правоў дзіцяці;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык прынцыпы фарміравання і паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь;

характарызаваць нормы маралі і нормы права як рэгулятары паводзін асобы; традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці і сацыякультурныя каштоўнасці беларускага грамадства; прыметы дзяржавы; структуру Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь; пакаленні правоў чалавека; грамадзянства як прававую сувязь з дзяржавай; беларускую дзяржаву па асноўных прыметах; правы дзіцяці ў Рэспубліцы Беларусь;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі «залатое правіла» маральнасці; прынцып падзелу ўлад; асноўныя прынцыпы правоў чалавека; узаемасувязь правоў і абавязкаў грамадзян; віды канстытуцыйных правоў і абавязкаў грамадзян Рэспублікі Беларусь; асаблівасці праваздольнасці, дзеяздольнасці і прававой адказнасці непаўналетніх у Рэспубліцы Беларусь, асаблівасці адказнасці за ўжыванне і незаконны абарот наркатычных сродкаў у Рэспубліцы Беларусь;

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

### Тэма 4. Чалавек у свеце культуры (6 гадзін)

Культура, яе прызначэнне і функцыі. Паняцце культуры. Функцыі культуры. Пераемнасць і развіццё культуры.

Элітарная, масавая, народная культура. Асаблівасці элітарнай культуры. Характэрныя рысы масавай культуры. Народная культура ў сучасным грамадстве.

Медыякультура сучаснага грамадства. Паняцці медыя і медыякультуры. Асаблівасці медыякультуры. Уплыў медыя на культуру асобы і грамадства. Інфармацыйная культура і інфармацыйная бяспека.

Субкультура і контркультура. Паняцце субкультуры. Віды маладзёжных субкультур. Контркультура.

Культурная разнастайнасць і дыялог культур. Універсальныя і ўнікальныя рысы культуры. Нацыянальныя культуры. Полікультурнае ўзаемадзеянне. Захаванне і развіццё нацыянальнай культурнай прасторы Беларусі.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: культура, масавая культура, медыя, медыякультура, народная культура, нацыянальная культура, субкультура, элітарная культура;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык дакладнасць інфармацыі ў масмедыя; этнакультурныя стэрэатыпы і праяўленні ксенафобіі; віды маладзёжных субкультур; функцыі культуры;

характарызаваць формы культуры (народная, масавая, элітарная);

спосабы захавання і развіцця нацыянальнай культуры;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі праяўленні духоўнай і матэрыяльнай культуры; ролю народнай культуры ў сучасным грамадстве; пераемнасць і развіццё культуры; адрозненні субкультуры ад контркультуры; праяўленні ўніверсальнага і ўнікальнага ў культуры; камерцыйны характар масавай культуры; уплыў медыя на культуру асобы і грамадства; узаемасувязь і ўзаемаўплыў элітарнай і масавай культуры; народную культуру як аснову нацыянальнай культуры; культурную разнастайнасць Беларусі; полікультурнае ўзаемадзеянне;

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

аналізаваць і ацэньваць медыятэксты;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Выніковае абагульненне (2 гадзіны).

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў X КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 34 гадзіны, у тым ліку 4 рэзервовых гадзіны)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

### Тэма 1. Сацыяльная сфера грамадства (6 гадзін)

Грамадства як сістэма. Паняцце грамадства. Сферы жыцця грамадства і сацыяльныя інстытуты. Сацыяльныя групы.

Сацыяльная структура грамадства. Паняцце сацыяльнай структуры. Сацыяльныя класы. Сацыяльныя страты.

Сацыяльныя статус, ролі і мабільнасць. Сацыяльны статус. Сацыяльныя ролі. Сацыяльная мабільнасць.

Сацыяльная камунікацыя. Паняцце сацыяльнай камунікацыі. Структура сацыяльнай камунікацыі. Віды сацыяльнай камунікацыі. Масавая камунікацыя.

Сацыяльныя працэсы і змяненне грамадства. Сацыяльны працэс і яго віды. Сутнасць і віды масавых паводзін. Сацыяльныя рухі.

Урок абагульнення.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: моладзь, грамадства, сацыяльная група, сацыяльная камунікацыя, сацыяльная мабільнасць, сацыяльная роля, сацыяльная страта, сацыяльная структура грамадства, сацыяльны рух, сацыяльнае дзеянне, сацыяльны інстытут, сацыяльны клас, сацыяльны працэс, сацыяльны статус, натоўп;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык асноўныя сацыяльныя супольнасці і групы, сферы жыцця грамадства, сацыяльныя інстытуты, сацыяльныя працэсы;

характарызаваць структуру і функцыі сацыяльнай групы, сацыяльны статус і ролі асобы, сацыяльную структуру як гарызантальную і вертыкальную арганізацыю грамадства, гарызантальную і вертыкальную мабільнасць, структуру сацыяльнай камунікацыі, моладзь як сацыяльную групу, сацыяльныя рухі;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі віды сацыяльных супольнасцей і груп, тыпы сацыяльных працэсаў, падыходы да сацыяльнай арганізацыі грамадства, віды і каналы сацыяльнай мабільнасці, масавыя дзеянні і віды масавых паводзін, віды сацыяльнай камунікацыі, асаблівасці масавай камунікацыі ў сучасным грамадстве;

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

## Тэма 2. Палітычная сфера грамадства (7 гадзін)

Палітыка і яе роля ў грамадскім жыцці. Паняцце палітыкі. Палітычныя эліты і лідары. Палітычная сістэма і яе функцыі.

Дзяржава ў палітычнай сістэме. Дзяржава – асноўны палітычны інстытут. Функцыі дзяржавы. Форма дзяржавы.

Дэмакратыя. Паняцце дэмакратыі. Формы дэмакратыі. Віды выбарчых сістэм. Прынцыпы дэмакратыі.

Прававая дзяржава і грамадзянская супольнасць. Прынцыпы прававой дзяржавы. Грамадзянская супольнасць і яе асноўныя інстытуты. СМІ і іх роля ў палітыцы.

Палітычныя ідэалогіі. Паняцце і функцыі палітычнай ідэалогіі. Асноўныя віды палітычнай ідэалогіі. Ідэалагічная разнастайнасць сучаснасці.

Палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні. Паняцце палітычнай партыі і яе функцыі. Палітычныя партыі і партыйныя сістэмы. Грамадскія аб’яднанні.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: дзяржава, грамадзянская супольнасць, дэмакратыя, выбарчая сістэма, канфедэрацыя, лідар, манархія, палітыка, палітычная ідэалогія, палітычная партыя, палітычная сістэма, палітычная эліта, прававая дзяржава, рэспубліка, унітарная дзяржава, федэрацыя;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык форму дзяржавы, грамадзянскую супольнасць, прававую дзяржаву, асноўныя віды палітычных ідэалогій, партыйныя сістэмы;

характарызаваць палітычны статус асобы, дзяржаву як асноўны палітычны інстытут, прамую і прадстаўнічую дэмакратыю, віды выбарчых сістэм, асноўныя інстытуты грамадзянскай супольнасці;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі сацыяльныя ролі асобы ў сістэме палітычных адносін (грамадзянін, выбаршчык, дэпутат), функцыі палітычнай сістэмы грамадства, асноўныя функцыі дзяржавы, прынцыпы дэмакратыі, прынцыпы прававой дзяржавы, узаемасувязь і ўзаемазалежнасць грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы, функцыі палітычнай ідэалогіі, палітычнай партыі, ролю СМІ ў палітыцы, адрозненне палітычнай партыі ад грамадскага аб’яднання;

устанаўліваць узаемасувязі вывучаных сацыяльных аб’ектаў, з’яў, працэсаў, іх элементаў і асноўных функцый;

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

### Тэма 3. Эканамічная сфера грамадства (8 гадзін)

Эканоміка і яе роля ў жыцці чалавека і грамадства. Паняцце эканомікі. Даброты, рэсурсы, вытворчасць. Эканамічныя суб’екты і іх узаемасувязі. Паняцце эканамічнай сістэмы.

Уласнасць і даходы. Адносіны ўласнасці. Асноўныя формы ўласнасці. Віды даходаў. Пражытачны мінімум.

Грашова-крэдытная сістэма. Грошы, іх функцыі і віды. Банкі і іх функцыі. Уклады і крэдытаванне.

Рынак: попыт, прапанова, рынкавы кошт. Паняцце і функцыі рынку. Попыт, прапанова і рынкавы кошт. Віды рынкаў.

Канкурэнцыя і яе роля ў эканоміцы. Паняцце канкурэнцыі. Віды канкурэнцыі. Менеджмент. Маркетынг.

Фінансавая сістэма грамадства. Паняцце фінансавай сістэмы. Дзяржаўны бюджэт. Падаткі, іх віды і роля ў эканоміцы.

Дзяржава і эканоміка. Задачы і метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Інфляцыя, яе віды і наступствы. Беспрацоўе, яго віды і наступствы. Сацыяльная палітыка.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: банк, беспрацоўе, бюджэт, грошы, даход, інфляцыя, канкурэнцыя, крэдыт, маркетынг, менеджмент, манаполія, падаткі, спажыванне, вытворчасць, рынак, уласнасць, фактар вытворчасці, фінансавая сістэма, цана, эканоміка;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык формы і адносіны ўласнасці, віды грошай, інфляцыю, манаполію;

характарызаваць эканамічныя сістэмы, прынцыпы крэдытавання, віды даходаў, функцыі рынку, функцыі грошай, віды рынкаў, віды канкурэнцыі, віды інфляцыі, віды беспрацоўя, маркетынг, метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, віды падаткаў, фактары вытворчасці, пражытачны мінімум;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць паміж патрэбамі і рэсурсамі ў працэсе эканамічнага выбару; ролю і ўзаемасувязь эканамічных суб’ектаў у эканоміцы; узаемасувязь паміж попытам, прапановай і коштам; ролю падаткаў у эканоміцы; узаемасувязь менеджменту і эфектыўнасці вытворчасці; ролю канкурэнцыі ў развіцці эканомікі; сацыяльна-эканамічныя наступствы інфляцыі і беспрацоўя; сістэму сацыяльнай абароны;

аналізаваць і ацэньваць на аснове статыстычных дадзеных стан эканомікі;

устанаўліваць узаемасувязі вывучаных сацыяльных аб’ектаў, з’яў, працэсаў, іх элементаў і асноўных функцый;

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Тэма 4. Духоўная сфера грамадства (6 гадзін)

Мараль. Сутнасць маральнай рэгуляцыі грамадскага жыцця. Імператыў маральных паводзін. Дынаміка маральных норм і ідэалаў. Этыка як навука пра мараль.

Рэлігія. Сутнасць рэлігіі, яе функцыі. Структурныя элемэнты рэлігіі. Сацыяльная дынаміка рэлігіі. Хрысціянства як духоўная аснова беларускага грамадства, міжканфесіянальнага міру і згоды.

Філасофія. Паняцце філасофіі і яе структура. Гістарычная дынаміка філасофіі. Філасофія ў сістэме культуры.

Навука. Навуковае пазнанне, мэты і каштоўнасці навукі. Узроўні навуковага пазнання. Класіфікацыя навук. Навука як сацыяльны інстытут.

Адукацыя. Паняцце адукацыі. Адукацыя як сацыяльны інстытут. Тэндэнцыі развіцця адукацыі.

Урок абагульнення.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ
ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: верацярпімасць, канфесія, навука, адукацыя, рэлігія, свабода сумлення, тэорыя, філасофія, эмпірыя, этыка;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык асноўныя маральныя вартасці, узроўні навуковага пазнання, рэлігіі, этычныя нормы;

характарызаваць асаблівасці маральнай рэгуляцыі; этыку як навуку аб маралі; структуру рэлігіі; свабоду сумлення і веравызнання; структуру філасофіі; філасофскія падыходы да пазнання рэчаіснасці; месца філасофіі ў сістэме культуры; асаблівасці навуковага пазнання; мэты і каштоўнасці навукі; тэндэнцыі ў развіцці адукацыі;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі функцыі рэлігіі, прыкладныя і фундаментальныя навуковыя даследаванні, секулярызацыю і сакралізацыю як працэсы развіцця рэлігіі, ролю адукацыі ў жыцці чалавека і грамадства, неабходнасць захавання норм этыкі незалежна ад мэт навуковых эксперыментаў;

устанаўліваць узаемасувязі вывучаных сацыяльных аб’ектаў, з’яў,

працэсаў, іх элементаў і асноўных функцый;

аргументаваць уласны пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Выніковае абагульненне (2 гадзіны).

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў XI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 34 гадзіны, у тым ліку 4 рэзервовыя гадзіны)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

### Тэма 1. Станаўленне сучаснай цывілізацыі (6 гадзін)

Прагрэс і рэгрэс у сацыяльным развіцці. Грамадскі прагрэс і яго крытэрыі. Выклікі і пагрозы для чалавецтва. Гуманізм як мера грамадскага прагрэсу.

Ступені грамадскага развіцця. Асноўныя падыходы да разгляду гісторыі грамадства. Фармацыйны падыход. Стадыяльны падыход. Тэхналагічны падыход.

Цывілізацыя як культурна-гістарычны працэс. Паняцце цывілізацыі. Цывілізацыйны падыход да вывучэння грамадства. Характэрныя рысы цывілізацыі XXI стагоддзя.

Гарызонты інфармацыйнага грамадства. Асноўныя характарыстыкі інфармацыйнага грамадства. Глабальная камп’ютарная сетка Інтэрнэт. Беларусь у інфармацыйную эпоху: магчымасці і перспектывы развіцця.

Глабалізацыя. Паняцце глабалізацыі. Супярэчлівы характар глабалізацыі. Антыглабалізм.

Урок абагульнення.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: глабалізацыя, гуманізм, інфармацыйнае грамадства, навукова-тэхнічны прагрэс, прагрэс, рэгрэс, цывілізацыя;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык асноўныя

падыходы да разгляду гісторыі грамадства, ступені развіцця грамадства, цывілізацыі як устойлівыя супольнасці людзей;

характарызаваць сучасныя выклікі і пагрозы для чалавецтва, крытэрыі грамадскага прагрэсу, глабалізацыю як супярэчлівы працэс; гуманізм як меру грамадскага прагрэсу; асноўныя рысы сучаснай інфармацыйнай цывілізацыі; прыметы постіндустрыяльнага грамадства; перспектывы развіцця Беларусі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства, ролю навукова-тэхнічнага прагрэсу ў развіцці чалавецтва; цывілізацыю як культурна-гістарычны працэс;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі антыглабалізм як сістэму поглядаў і сацыяльны рух, даіндустрыяльную, індустрыяльную і постіндустрыяльную стадыі развіцця грамадства; праяўленні прагрэсу і рэгрэсу ў сучасным свеце, асноўныя прыметы інфармацыйнага грамадства; фактары глабалізацыі;

устанаўліваць узаемасувязі вывучаных сацыяльных аб’ектаў, з’яў, працэсаў, іх элементаў і асноўных функцый;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

аргументаваць свой пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Тэма 2. Беларусь у сучаснай сусветнай супольнасці (6 гадзін)

Сусветная супольнасць у XXI стагоддзі. Фактары разнастайнасці сучаснага свету. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя сістэмы ў сучасным свеце. Міграцыйная мабільнасць і яе наступствы.

Устойлівае развіццё – мадэль развіцця XXI стагоддзя. Паняцце ўстойлівага развіцця. Напрамкі ўстойлівага развіцця. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь. Дасягненні Рэспублікі Беларусь у галіне ўстойлівага развіцця. Прыярытэты ўстойлівага развіцця ва ўмовах канкурэнцыі і санкцыйнага рэжыму.

Прававыя асновы міжнародных адносін. Асноўныя прынцыпы міжнароднага права. Крызісныя працэсы ў сферы міжнароднага права. Функцыі міжнароднага гуманітарнага права. Міжнародна-прававая адказнасць.

Геапалітычнае становішча і нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. Паняцце геапалітыкі. Геапалітычны статус Беларусі. Нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная бяспека: рызыкі, выклікі, пагрозы.

Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін. Паняцце і віды міжнародных адносін. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь. Удзел Беларусі ў міжнародных арганізацыях і міжнародным супрацоўніцтве.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: геапалітыка, інфармацыйная бяспека, міжнароднае гуманітарнае права, міжнародныя адносіны, міграцыйная мабільнасць, нацыянальная бяспека, устойлівае развіццё;

міжнародныя арганізацыі і міждзяржаўныя аб’яднанні, у якія ўваходзіць Беларусь;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык прынцыпы міжнароднага гуманітарнага права, мэты ўстойлівага развіцця;

характарызаваць віды міжнародных адносін, геапалітычны статус Беларусі, месца Беларусі ў сістэме глабальных міжнародных адносін, міграцыйную мабільнасць і яе наступствы; нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь, асноўныя сродкі міжнароднага супрацоўніцтва, прынцыпы і напрамкі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, ролю Беларусі ў рэалізацыі канцэпцыі ўстойлівага развіцця, дасягненні ў галіне ўстойлівага развіцця; крызісныя працэсы ў сферы міжнароднага права; функцыі міжнароднага гуманітарнага права; нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь; удзел Рэспублікі Беларусь у Саюзнай дзяржаве і Еўразійскім эканамічным саюзе;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі кірункі ўстойлівага развіцця, прынцыпы міжнароднага права, спосабы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі краіны, фактары разнастайнасці сучаснага свету;

устанаўліваць узаемасувязі вывучаных сацыяльных аб’ектаў, з’яў, працэсаў, іх элементаў і асноўных функцый;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

аргументаваць свой пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

### Тэма 3. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь (9 гадзін)

Канстытуцыйнае і выбарчае права. Права як сістэма норм. Месца Канстытуцыі ў прававой сістэме. Паняцце канстытуцыйнага права. Выбарчая сістэма ў Рэспубліцы Беларусь. Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.

Асновы грамадзянскага права. Паняцце грамадзянскага права. Суб’екты грамадзянска-прававых адносін. Грамадзянская праваздольнасць

і дзеяздольнасць.

Асновы сямейнага права. Паняцце сямейнага права. Правы і абавязкі мужа і жонкі. Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.

Асновы працоўнага права. Паняцце працоўнага права. Заключэнне працоўнага дагавору. Бакі працоўнага дагавору. Спыненне працоўнага дагавору.

Асновы адміністрацыйнага права. Паняцце адміністрацыйнага права. Адміністрацыйнае правапарушэнне. Адміністрацыйная адказнасць.

Асновы крымінальнага права. Паняцце крымінальнага права. Крымінальная адказнасць і пакаранне. Абставіны, якія выключаюць, змякчаюць і абцяжарваюць крымінальную адказнасць.

Забеспячэнне законнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь. Сістэма органаў забеспячэння законнасці і правапарадку. Судовая сістэма. Праваахоўныя органы. Органы юстыцыі.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: адміністрацыйнае права, адміністрацыйнае правапарушэнне, грамадзянская дзеяздольнасць, грамадзянская правяздольнасць, грамадзянскае права, выбарчае права, канстытуцыйнае права, пакаранне, сямейнае права, працоўнае права, працоўны дагавор, крымінальнае права;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык галіну прымянення норм (грамадзянскага, працоўнага, адміністрацыйнага, сямейнага, выбарчага, крымінальнага) права, органы забеспячэння законнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь;

характарызаваць віды рэферэндумаў; месца Канстытуцыі ў прававой сістэме; абставіны, якія выключаюць, змякчаюць і абцяжарваюць крымінальную адказнасць; асноўныя задачы органаў забеспячэння законнасці і правапарадку Рэспублікі Беларусь; асаблівасці канстытуцыйнага права ў сістэме права Рэспублікі Беларусь; правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў; прававы механізм заключэння і спынення шлюбу; прававы механізм працаўладкавання і спынення працоўнага дагавору; прыметы адміністрацыйнага правапарушэння; прыметы, якія характарызуюць злачынства; прынцыпы і асноўныя стадыі выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь; юрыдычныя ўласцівасці Канстытуцыі; суб’ектаў грамадзянска-прававых адносін;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі віды адміністрацыйных спагнанняў; віды пакаранняў, прадугледжаных Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь; грамадзянскую праваздольнасць і дзеяздольнасць фізічных і юрыдычных асоб; нормы працоўнага права, якія рэгулююць рабочы час, час адпачынку, аплату працы работніка; правы і абавязкі мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей;

мадэляваць тыповыя сітуацыі, якія рэгулююцца нормамі вывучаных галін права;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

аргументаваць свой пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Тэма 4. Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы (6 гадзін)

Дынаміка складу насельніцтва і сацыяльная палітыка дзяржавы. Сацыяльны склад насельніцтва. Дэмаграфічная палітыка. Гендэрная палітыка. Дзяржаўная маладзёжная палітыка. Моладзь – стратэгічны рэзерв дзяржавы. Нацыянальная палітыка. Канфесійная палітыка. Асаблівасці сучаснай сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Беларускія сацыяльныя арыенціры і сацыяльныя гарантыі для грамадзян.

Інавацыйнае развіццё краіны. Паняцце інавацыйнага шляху развіцця. Навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. Навуковае забеспячэнне інавацыйнага развіцця. Высокія тэхналогіі і энергазберажэнне.

Развіццё рэгіёнаў. Рэгіёны Рэспублікі Беларусь. Рэгіянальная палітыка. Перспектывы развіцця рэгіёнаў. Малыя гарады Беларусі і перспектывы развіцця сяла.

Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі. Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры. Гістарычная памяць беларускага народа. Дзяржаўная палітыка ў галіне здароўя. Дзяржаўная палітыка ў сферы фізічнай культуры і спорта. Дзяржаўная палітыка ў сферы прафілактыкі спажывання наркатычных сродкаў. Сацыяльныя наступствы спажывання наркотыкаў.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнне паняццяў: гендарная палітыка, дэмаграфічная бяспека, дэмаграфічная палітыка, інавацыі, інавацыйная палітыка, канфесійная палітыка, маладзёжная палітыка, нацыянальная палітыка, рэгіянальная

палітыка;

умець:

распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь, тыпы інавацый;

характарызаваць мэты і задачы развіцця малых і сярэдніх гарадоў Беларусі; задачы нацыянальнай інавацыйнай сістэмы; дасягненні ў развіцці навуковага патэнцыялу, культуры, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту суверэннай Беларусі; праблемы і перспектывы развіцця рэгіёнаў; высокія тэхналогіі; сацыяльныя наступствы спажывання наркотыкаў;

тлумачыць і (або) канкрэтызаваць прыкладамі дынаміку сацыяльнага складу насельніцтва, асноўныя напрамкі дэмаграфічнай, гендарнай, рэгіянальнай, нацыянальнай, канфесійнай, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі; дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры; дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы здароўя; дзяржаўнай палітыкі у сферы фізічнай культуры і спорту; дзяржаўнай палітыкі ў сферы прафілактыкі спажывання наркатычных сродкаў; асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

устанаўліваць узаемасувязі вывучаных сацыяльных аб’ектаў, з’яў, працэсаў, іх элементаў і асноўных функцый;

даваць ацэнку вывучаным грамадскім з’явам і працэсам;

аргументаваць свой пункт гледжання па пытаннях, якія вывучаюцца;

прымяняць засвоеныя веды і ўменні пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Выніковае абагульненне (2 гадзіны).